# ПЕРСПЕКТЫЎНЫЯ ВІДЫ ТУРЫЗМУ НА АСНОВЕ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ СЯДЗІБНА-ПАРКАВЫХ КОМПЛЕКСАЎ БЕЛАРУСІ

***Д. У. Філіпчык***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, fdv91@mail.ru*

У артыкуле разгледжаны магчымасці развіцця на аснове культурнай спадчыны сядзібна-паркавых комплексаў Беларусі розных відаў турызму. Прыведзены прыклады арганізацыі гісторыка-культурнага, гастранамічнага, адукацыйнага, прамысловага турызму з выкарыстаннем турыстычнага патэнцыялу сядзібна-паркавых комплексаў.

***Ключавыя словы:*** сядзібна-паркавыя комплексы; гісторыка-культурны турызм, гастранамічны турызм, адукацыйны турызм, прамысловы турызм.

# ПЕРСПЕКТИВНЫЕ ВИДЫ ТУРИЗМА НА ОСНОВЕ КУЛЬТУРНОГО НАСЛЕДИЯ УСАДЕБНО-ПАРКОВЫХ КОМПЛЕКСОВ БЕЛАРУСИ

***Д. В. Филипчик***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, Минск, Беларусь, fdv91@mail.ru*

В статье рассматриваются возможности развития различных видов туризма на основе культурного наследия усадебно-парковых комплексов Беларуси. Приведены примеры организации историко-культурного, гастрономического, познавательного, промышленного туризма с использованием туристического потенциала усадебно-парковых комплексов.

***Ключевые слова:*** усадебно-парковые комплексы; историко-культурный туризм, гастрономический туризм, познавательный туризм, промышленный туризм.

# PROSPECTIVE TYPES OF TOURISM BASED ON THE CULTURAL HERITAGE OF THE ESTATE AND PARK COMPLEXES OF BELARUS

***D. U. Filipchyk***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, fdv91@mail.ru*

The article examines the possibilities of development of various types of tourism based on the cultural heritage of estate and park complexes of Belarus. Examples of the organization of historical and cultural, gastronomic, educational tourism, industrial tourism using the tourist potential of manor and park complexes are given.

***Keywords:*** estate and park complexes; historical and cultural tourism, gastronomic tourism, educational tourism, industrial tourism.

Сядзібна-паркавыя комплексы Беларусі з’яўляюцца вельмі важнай часткай культурнай спадчыны краіны. Дадзеныя аб’екты былі цэнтрамі

палітычнага, культурнага, эканамічнага жыцця. Таму сядзібна-паркавыя комплексы варта разумець як «частку культурнага ландшафту, дзе спалучаюцца помнікі сядзібнай архітэктуры і садова-паркавага мастацтва пэўнай мясцовасці, значную для захавання і прадстаўлення гісторыка-культурнай спадчыны краіны або рэгіёну» [2, л. 47].

Сядзібна-паркавыя комплексы нельга суадносіць толькі з захаваўшыміся пабудовамі або іх фрагментамі. Іх трэба імкнуцца ўспрымаць шырай, а менавіта як спецыфічны культурны ландшафт. Існуе вялікая колькасць падыходаў да вызначэння сутнасці культурнага ладшафта. У артыкуле будзем разумець пад ім «прыродна-культурны тэрытарыяльны комплекс, які сфарміраваўся ў выніку эвалюцыйнага ўзаемадзеяння прыроды і чалавека, яго сацыякультурнай і гаспадарчай дзейнасці і які складаецца з характэрных спалучэнняў прыродных і культурных кампанентаў, якія знаходзяцца ва ўстойлівай узаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці» [3, с. 16].

Комплексны характар спадчыны сядзібна-паркавых комплексаў дазваляе на іх аснове развіваць розныя віды турызму. У 2023 г. пастановай Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь № 36 «Аб вядзенні Адзінай класіфікацыі відаў турызму ў Рэспубліцы Беларусь» было вылучана 13 відаў турызму: аграэкатурызм, актыўны, гастранамічны, дзелавы, гісторыка-культурны, лячэбна-аздараўленчы, медыцынскі, адукацыйны, паляўнічы, прамысловы, рэлігійны, падзейны, экалагічны [5]. Ніжэй разгледзім тыя віды турызму, якія маюць патэнцыял для развіцця на аснове сядзібна-паркавых комплексаў Беларусі.

Найбольш перспектыўны для развіцця на аснове сядзібна-паркавых комплексаў гэта ***гісторыка-культурны турызм*** пад якім, паводле пастановы, разумеецца «турыстычнае падарожжа з мэтай вывучэння гісторыі і культуры, а таксама дзейнасць па арганізацыі гэтага турыстычнага падарожжа» [5]. Сядзібы нават у самай дрэннай ступені захаванасці з’яўляюцца крыніцамі гістарычнай і культуралагічнай інфармацыі, якая можа выклікаць цікавасць у падарожнікаў. Паколькі культурнае жыццё сядзіб было вельмі разнастайна, то на аснове іх наведвання магчыма рэалізаваць амаль усю разнастайнасць разнавіднасцяў гісторыка-культурнага турызму.

Літаратурны турызм можна развіваць на сядзібах, звязаных з жыццём і творчасцю вядомых літаратараў. Так, сядзіба Багушэвічаў у в. Кушляны (Смаргонскі раён) музеефікавана і расказвае пра жыццёвы і творчы шлях паэта. У той жа час аб’ект з’яўляецца прыкладам сядзібнага дома небагатай

шляхты, ілюструе маёмаснае расслаенне прывілеяванага саслоўя на беларускіх землях. Сядзіба Мінейкаў у в. Дубнікі (Астравецкі раён) звязана з творчасцю польскага пісьменніка Г. Сянкевіча, які працаваў там над раманам «Пан Валадыеўскі».

Музычная культура беларускіх зямель таксама цесна пераплецена з гісторыяй сядзібна-паркавых комплексаў. Сядзіба ў г. п. Смілавічы (Чэрвеньскі раён) звязана з родам Манюшкаў, з якога паходзіў вядомы кампазітар Станіслаў Манюшка. Будынак сядзібы знаходзіцца на рэстаўрацыі, але ў самім пасёлку ў 2017 г. адкрылася музычная гасцёўня, дзе створана спецыяльная культурная прастора з музейнай экспазіцыяй і канцэртнай залай. Адноўлены культурны ландшафт сядзібна-паркавага комплексу ў в. Залессе, дзе жыў і ствараў свае творы вядомы кампазітар і грамадска-палітычны дзеяч М. К. Агінскі.

Сядзібна-паркавыя комплексы былі цэнтрамі тэатральнай культуры. Там не толькі ставіліся п’есы еўрапейскіх аўтараў, але і творы ўраджэнцаў нашых земляў. Для гэтых мэт адводзіліся спецыяльныя памяшканні ў сядзібах або нават узводзіліся асобныя будынкі, ствараліся балетныя і тэатральныя школы, аркестры. Палацава-паркавыя комплексы Радзівілаў у Нясвіжы (Нясвіжскі раён), Сапегаў у Ружанах (Пружанскі раён) могуць спецыялізавацца на дадзенай разнавіднасці гісторыка-культурнага турызму.

Перспектыўны для развіцця на аснове сядзібна-паркавых комплексаў ***гастранамічны турызм***, пад якім разумеецца «турыстычнае падарожжа ў мэтах азнаямлення з краінай, рэгіёнам, мясцовасцю праз далучэнне да нацыянальнай гастраноміі, асаблівасцей вытворчасці і прыгатавання нацыянальных страў, іншай харчовай прадукцыі, а таксама дзейнасць па арганізацыі гэтага турыстычнага падарожжа» [5].

Кухня прывілеяванага саслоўя на беларускіх землях адрознівалася багаццем мясных страў, больш складанымі рэцэптамі і спосабамі прыгатавання ежы, наяўнасцю запазычанняў і прывазных прадуктаў. Адраджэнне традыцый шляхецкага застолля, прадстаўленне іх турыстам на анімацыйных мерапрыемствах, арганізацыя дэгустацый прадстаўляюцца перспектыўнымі крокамі для развіцця гастранамічнага турызму ў сядзібна-паркавых комплексах. У адноўленых і музеефікаваных аб’ектах (Косава, Лошыца, Мір, Нясвіж) дзейнічаюць прадпрыемствы харчавання, гэтай тэматыцы прысвечаны раздзелы экспазіцый. Парк-музей інтэрактыўнай гісторыі «Сула» ў турыстычнай дзейнасці інтэрпрэтуе традыцыі прыгатавання алкагольных напояў на сядзібных броварах. Важна, каб у

працы па інтэрпрэтацыі шляхецкай кухні спецыялісты абапіраліся на мясцовы матэрыял, праверaныя факты, пазбягалі містыфікацый.

Унікальным прыкладам захавання ў жывой форме традыцый шляхецкай кухні з'яўляецца элемент нематэрыяльнай культурнай спадчыны «Традыцыя прыгатавання «Поразаўскай банкухі». Элемент у 2020 г. прызнаны нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасцю [7]. Па сведчаннях мясцовых жыхароў рэцэпт і традыцыю прыгатавання банкухі іх продкі перанялі ў сядзібе Бутаўт-Андрэйкавічаў «Багудзенкі» ў г. п. Поразава (Свіслацкі раён). Пры ўмове аднаўлення сядзібы адкрываюцца магчымасці для распрацоўкі розных інтэрпрэтацыйных гастранамічных праграм, звязаных з гэтай стравай.

Сядзібна-паркавыя комплексы могуць актыўна выкарыстоўвацца для адукацыйных мэт, адпаведна, і для развіцця ***адукацыйнага турызму***. Гэта «турыстычнае падарожжа ў адукацыйных мэтах, а таксама дзейнасць па арганізацыі гэтага турыстычнага падарожжа» [5]. Сядзібы даюць нагляднае ўяўленне аб змяненні архітэктурных стыляў, развіцці культуры, прыродных аб'ектах і г. д. Напрыклад, на базе сядзібы Наркевічаў-Ёдкі «Наднёман» у п. Наднёман (Уздзенскі раён) мэтазгодна рэалізоўваць адукацыйныя праграмы, якія пазнаёмяць навучэнцаў з развіццём навукі і тэхнікі на беларускіх землях, дзейнасцю эксперыментатара ў галіне медыцыны, вынаходніка электраграфіі і бяздротавай перадачы электрычных сігналаў, стваральніка метэаралагічнай станцыі Якуба Атонавіча Наркевіча-Ёдкі. Фонд імя Я. А. Наркевіча-Ёдкі плануе арганізацыю на базе адноўленай сядзібы дзеючай лабараторыі, метэастанцыі, музея, стварэнне клубаў, гурткоў, цэнтраў, правядзенне летніх школ і г. д. [6].

Неад'емная частка сядзібна-паркавага комплексу – гэта гаспадарчыя і вытворчыя пабудовы. На іх аснове магчыма развіццё ***прамысловага турызму***. Частка сядзібных пабудоў у савецкія гады былі мадэрнізаваны, уключаны ў новыя прамысловыя комплексы і функцыянуюць да гэтага часу. Напрыклад, у якасці філіяла ААТ «Гродзенскі лікёра-гарэлачны завод» працуе спіртзавод, заснаваны яшчэ ў 1896 г. Святаполк-Мірскімі ў г. п. Мір. У якасці філіяла таго ж прадпрыемства працуе спіртзавод у в. Варонча (Карэліцкі раён). Ён займае будынак былой сядзібы, перабудаваны ў 1898 г. пад патрэбы бровара. На базе прамысловага комплексу Горватаў у г. Нароўля працуе і прымае экскурсійныя групы ААТ «Чырвоны Мазыранін».

Значная частка прадпрыемстваў, якія выкарыстоўвалі прамысловую спадчыну сядзібна-паркавых комплексаў, спыніла сваю працу і знаходзіцца

ў закансерваваным стане. Такі лёс прамысловай спадчыны сядзіб у Карме (Кармянскі раён), Жамыслаўі (Іўеўскі раён), Лынтупах (Пастаўскі раён).

Вытворчая спадчына сядзібных комплексаў можа быць выкарыстана і для музеефікацыі з наступным уключэннем у турыстычную дзейнасць. Яскравым прыкладам служыць выкарыстанне млына сядзібы Вольскіх у в. Дворышча (Лідскі раён) для размяшчэння шматфункцыянальнага турыстычнага комплексу «Вольны млынар». Падобным чынам пасля рэстаўрацыі, якая пачалася ў 2011 г., быў выкарыстаны бровар сядзібы Багдановічаў у в. Стайкі (Вілейскі раён). Аб’ект адноўлены і прыстасаваны для аказання паслуг па арганізацыі харчавання, правядзенні мерапрыемстваў, пражыванні.

Гаспадарчыя і прамысловыя пабудовы сядзібна-паркавых комплексаў валодаюць значным патэнцыялам у перспектыве іх аднаўлення з мэтай дэманстрацыі гістарычных форм вядзення гаспадаркі (вэнджання, вытворчасці сыроў, захоўвання прадуктаў, развядзення коней і г.д.). Праца ў гэтым напрамку вядзецца ў сядзібна-паркавым комплексе Агінскіх у аг. Залессе (Смаргонскі раён). Там у 2021 г. пачалося аднаўленне стайні, якую плануецца выкарыстоўваць па прамым прызначэнні [1]. Выкарыстанне коней для катання турыстаў аднаўляе адзін са страчаных элементаў культурнага ландшафту, дыверсіфікуе паслугі, якія прадстаўляюцца музеем.

Сядзібна-паркавыя комплексы Беларусі валодаюць значным патэнцыялам для развіцця на іх аснове розных відаў турызму. Акрамя гісторыка-культурнага турызму і яго разнавіднасцяў на аснове сядзібна-паркавых комплексаў развіваецца гастранамічны, адукацыйны, прамысловы і іншыя віды турызму. Рэстаўрацыя і даследаванне гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны сядзібна-паркавых комплексаў дазваляе развіваць на іх аснове новыя віды турызму, дыверсіфікаваць і абнаўляць турыстычны прадукт.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. В Залесье восстанавливают здание конюшни [Электронный ресурс]. Режим доступа: https://www. shliah.by/news/obshhestvo/news24287. html. Дата доступа: 16. 08. 2023.

2. Герасімёнак Д. В. Музеефікацыя сядзібна-паркавых комплексаў Рэспублікі Беларусь як сродак актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны: дыс. на саісканне вуч. ступ. канд. культ. : спец. 24. 00. 03 Музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб'ектаў. Мінск, 2018.

3. Культурный ландшафт как объект наследия. Под ред. Ю. А. Веденина, М. Е. Кулешовой. М.: Институт Наследия; СПб.: Дмитрий Буланин, 2004.

4. Филипчик Д. В. Оценка туристического потенциала дворцово-парковых ансамблей и усадебно-парковых комплексов Беларуси. Минск: Белстан, 2023.

5. Постановление Министерства спорта и туризма Республики Беларусь от 7 августа 2023 г. № 36 «О ведении Единой классификации видов туризма в Республике Беларусь» [Электронный ресурс]. Режим доступа: 6. https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=W22340307 . Дата доступа: 20. 08. 2023.

6. Профессор Якуб Наркевич-Иодко [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://narkevich-jodko. org/#!/museum. Дата доступа: 17. 08. 2023.

7. Традыцыя прыгатавання «Поразаўскай банкухі» [Электронный ресурс]. Режим доступа: https://livingheritage.by/nks/7704/. Дата доступа: 16. 08. 2023.